# ГЕНЕАЛАГІЧНЫ ПРАЕКТ

# «Мой радавод у фармаце Вікіпедыі»

Аўтар - Галузіна Вольга,
вучаніца 3 класа
Кіраўнік - Акулёнак (Галузіна) І.І.,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры

# Актуальнасць тэмы

- Праз гісторыю рода ўжывую спасцігаецца гісторыя і сучаснасць. Стыхійна гэта адбываецца ў кожнай сям'і праз аповеды і жывыя зносіны, але вусныя апавяданні і паданні недаўгавечныя, многае з часам губляецца, таму неабходны спецыяльныя намаганні, каб гісторыя рода не знікла бясследна.

## Мэта даследавання

вывучэнне радаводу Галузіных і лёсу яго асобных прадстаўнікоў як носьбітаў гістарычнай памяці, нашчадкаў лепшых рыс, каштоўнасцей і якасцей продкаў

## Задачы даследавання

1. Выяўленне невядомых фактаў біяграфіі маёй сям'і.
2. Стварэнне цікавага і пазнавальнага артыкула аб яе гісторыі.
3. Распаўсюджванне вядомых мне фактаў сярод родзічаў.
4. Захаванне знойдзеных фактаў для будучых пакаленняў.

# План работы

- 
- - Фармулёўка праблемы, мэты і гіпотэзы даследавання;
- - Падбор матэрыялу;
- - Пошук інфармацыі ў Інтэрнэце;
- - Стварэнне мультымедыйнай прэзентацыі.

# Гіпотэза

**Магчыма,**
**што ў выніку даследавання атрымаецца не толькі цалкам сабраць фактычны сямейны матэрыял, знайсці раней невядомыя факты з жыцця маіх родзічаў, але і аформіць усё гэта ў выглядзе цікавай работы, захоўваючы яе для будучых пакаленняў, якія не застануць ужывых сведкаў далёкіх падзей**

## Матэрыял для даследавання

**фотаархіў, дакументы (пасведчанні аб нараджэнні, аб заключэнні шлюбу, атэстаты і г. д.)**

# Бабуля Галя






КОМСОМОЛЬСКИЙ БИЛЕТ
№35032002
КОМСАМОЛЬСКI БIЛЕТ
№35032002


ДЫПЛОМ
№ 078467
ДИПЛОМ
№ 078467




Трудовая книжка

# Старонкі энцыклапедыі

**Г**

- **Галіна Галузіна (Сокал) – мая бабуля па татавай лініі. Нарадзілася 2 ліпеня 1935 года ў в.Вострава Капыльскага раёна. Вельмі добра вучылася, адразу паступіла ў педагагічны інстытут імя Горкага на фізіка-матэматычны факультэт, але правучылася ўсяго толькі 2 месяцы, бо не было матэрыяльнай падтрымкі. Пайшла працаваць на Мінскі аўтамабільны завод, там сустрэла каханне, выйшла замуж і паехала на радзіму мужа -у Астраханскую вобласць. Уладкавалася на мясцовы кансервавы завод, а ў 1962 годзе вярнулася на радзіму і пайшла працаваць на Радзівіламонтаўскі кансервавы завод. У 1966 годзе скончыла Маладзечанскі палітэхнічны тэхнікум па спецыяльнасці тэхнік – тэхнолаг. Усё сваё астатняе жыццё звязала з кансервавым заводам: рабочая, хімік-лабарант, майстар цэха дзіцячага харчавання, начальнік цэха дзіцячага харчавання, загадчык склада. На пенсію выйшла ў 1992 годзе, занялася выхаваннем унукаў і хатняй гаспадаркай. На жаль, 8 сакавіка 2014 годзе мая бабуля пайшла з жыцця.**

- **Ганна Сокал (Борыс) – прабабуля**, мама маёй бабулі Галі. Нарадзілася ў 1900 годзе ў в. Крывасёлкі Капыльскага раёна ў беднай сям’і, рана асірацела, гадавала мачыха. Малапісьменная, але прыгожая дзяўчына запаланіла сэрца адукаванага юнака, выйшла за яго замуж, нарадзіла 5 дзяцей. Пасля смерці мужа ў 1947 годзе астатняе жыццё правяла ў сем’ях дачок, гэты свет пакінула 26 снежня 1986 года.

# Дзядуля Іван
















# Старонкі энцыклапедыі

**I**

- **Іван Галузін – мой дзед, татаў бацька**. Нарадзіўся ў Чэрвеньскім раёне. Існуюць 2 версіі даты нараджэння – 1 чэрвеня (запісана ў пашпарце) і 1 мая(са слоў прабабулі Дамінікі). Мы святкуем 1 мая.

Многа дзе майму дзеду прыйшлося папрацаваць: слесар і токар Мінскага аўтамабільнага завода, прадпрыемства “Волгаэнергарамонт”, Харабалінскі кансервавы завод, Харабалінская нафатабаза і нарэшце Клецкі кансервавы завод. Па ўспамінах родзічаў і суседзяў, у дзеда Івана былі “залатыя рукі”, мог адрамантваць любую машыну. Гэтыя якасці перадаліся і майму тату. З 1979 года дзед знаходзіўся на пенсіі па інваліднасці, а ў 1988 годзе 11 верасня памёр. Я яго ніколі не бачыла.

# Мой тата Сяргей











ПРОФЕССИОНАЛЬНЫЕ СОЮЗЫ СССР
ПРОФСОЮЗНЫЙ БИЛЕТ
№ 10772649

Профсоюз работников просвещения ВШ и НУ

Фамилия Галузин
И., О. Сергей Иванович
Год рождения 1966
Профессия студент
Год вступления в союз 1.09.83
Наименование организации, выдавшей билет МРТИ

1 сентября 1983 г.

Председатель комитета

Личная подпись

ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫЯ САЮЗЫ СССР
ПРАФСАЮЗНЫ БІЛЕТ

Прафсаюз работнікаў асветы ВШ і НУ

Прозвішча Галузін
Імя, імя па бацьку Сяргей Іван.
Год нараджэння 1966
Прафесія студэнт
Год уступлення ў саюз 1.09.83
Назва арганізацыі, якая выдала білет МРТІ

Старшыня камітэта

Асабісты подпіс

# Старонкі энцыклапедыі

<u>**С**</u>

- <u>**Сяргей Галузін – мой татачка**</u>**. Нарадзіўся 21 верасня 1966 года на праваслаўнае свята Багач, скончыў Чырваназоркаўскую школу ўсяго з 2 чацвёркамі, Мінскі радыётэхнічны інстытут. Па размеркаванні трапіў на Клецкі механічны завод і вось ужо болей за 25 год там працуе. Тата – чалавек адкрытага і шчырага сэрца, вельмі сціплы, ураўнаважаны. Яго паважаюць, нават старэйшыя звяртаюцца пачціва “Сяргей Іванавіч”. Тата разбіраецца ў розных прыладах, да яго запісваецца чарга на рамонт. Ён дапамагае работнікам сельскай гаспадаркі раёна, рамантуючы складаную тэхніку. Для гэтага тата праходзіў навучанне ў Германіі. Я яго вельмі-вельмі люблю.**

https://be.wikipedia.org/wiki/Радавод

**Праект Радавод — адкрытае шматмоўнае генеалагічнае дрэва, у якім кожны можа змяніць або дапоўніць любую сям'ю, любога чалавека і пабудаваць сваё ўласнае радавое дрэва**

## http://be.radavod.wikia.com/wiki/Radavod_Wiki

**Вітаем у Radavod Wiki – вольнай генэалягічнай энцыкляпэдыі, якую можа рэдагаваць кожны. У беларускамоўнай вікіпэдыі цяпер 0 056 артыкулаў.**

**Генэалягічныя вікіпэдыі існуюць таксама на іншых мовах: на ангельскай - Familypedia, расейскай - Genealogia Wiki, і французскай - Familles**

# https://ru.wikipedia.org/wiki/Familypedia

- URL: familypedia.wikia.com
- Коммерческий: Нет
- Тип сайта: Генеалогический
- Регистрация: Необязательная (за исключением необходимости загрузки файлов и редактирования защищённых страниц)
- Язык(-и): Мультиязычный
- Расположение сервера: Майами, Флорида
- Владелец: Wikia
- Начало работы: 2004
- Текущий статус: Активный

# Заключэнне

- Важна не проста намаляваць сямейнае дрэва, а важна зразумець, чым жылі нашыя продкі, якія сямейныя традыцыі, характары ўласцівыя нашым продкам.
- Гэта значыць, вывучэнне радаводу сям'і, гісторыі продкаў і пабудова сямейнага дрэва можа апынуцца не толькі цікавым і захапляльным заняткам, але яшчэ і даць вельмі карысную інфармацыю для нас і нашых нашчадкаў.

- **Любоў да Радзімы выказвай употай,**
**Услых жа аб ёй толькі зрэдку кажы.**
**Лепш памятай, скуль ты, з каго ты і хто ты,**
**Глыбінную повязь вякоў зберажы.**

- **О продкаў імёны! Скрозь далеч Сусвету –**
**Нібыта далёкіх стагоддзяў агні!**
**Датуль мы не згінем на свеце на гэтым,**
**Пакуль будзем помніць свае карані.**